**Палулех, З.** Баявыя вылеты Пятра Шакеля / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2013. — 6 лістап. — С. 2.

## БАЯВЫЯ ВЫЛЕТЫ ПЯТРА ШАКЕЛЯ



**Дваццаць пяць гадоў таму назад завяршылася ваенная аперацыя абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане. Вайна, якая доўгія гады бушавала на гарачай афганскай зямлі, стала горкай старонкай гісторыі. А для тых, хто прайшоў праз яе пекла, водгукі баёў чутны і сёння.**

Сярод воінаў-інтэрнацыяналістаў шмат і нашых землякоў. У іх ліку і браслаўчанін Пётр Шакель.

Расказваць і ўспамінаць пра ваенныя дзеянні ў Афганістане Пётр не любіць. Але да гэтай пары захоўвае нешматлікія чорна-белыя фотаздымкі тых часоў. Яны блякнуць з гадамі, але па-ранейшаму з'яуляюцца часцінкай біяграфіі цяпер ужо пабеленага сівізной на скронях статнага мужчыны.

Пра прафесію ваеннага Пётр Шакель марыў з дзяцінства. Прыцягвала яго менавіта авіяцыя. Узмоцнена займаўся фізічнай падрыхтоўкай, загартоўваў характар.

Першая спроба паступіць у ваеннае вучылішча аказалася няўдачнай. Пётр не здаваўся і ўпарта ішоў да сваей мэты: прайшоў падрыхтоўку па лётнай справе ў Віцебскім, а затым Вязнікаўскім у Расіі авіяцыйна-вучэбных цэнтрах. Пазней скончыў Сызраньскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча і атрымаў званне лейтэнанта. Гэта быў 1982 год. Маладыя афіцэры ведалі пра вайну ў Афганістане. Але ім, дваццацігадовым юнакам, тады не верылася, што трапіць туды могуць і яны. Але, але...

Верталётам у той вайне суджана было заняць асаблівае месца. У сілах сваёй універсальнасці гэтая тэхніка выкарыстоўвалася для вырашэння шырокага кола баявых задач.

І на Мі-24 П. Шакелю разам з экіпажам амаль кожны дзень даводзілася рабіць баявыя вылеты. Часу на адпачынак практычна не было. Але, прызнаецца Пётр, чалавек прывыкае да ўсяго, нават да вайны. Стомленыя да знемажэння верталётчыкі, калі выпадала, засыналі імгненна, не зважаючы на стрэлы, аўтаматныя чэргі, бамбёжкі. У такім пекле прайшоў год.

Вяртанне ў мірнае жыццё было доўгачаканым і, вядома ж, радасным. Адзінае, што засмучала, вельмі кароткае спатканне з роднымі. Бо зноў клікала служба. Спачатку тры гады

адслужыў у Германіі, затым на Далёкім Усходзе. А ў 1987 годзе ў складзе спецыяльнай эскадрыллі Пётр Шакель у чарговы раз трапляе на афганскую вайну. Усё паўтараецца, як і ў першы раз. Псіхалагічна, кажа, лягчэй не стала, але адаптацыя да падзей і мясцовасці, спякотнага афганскага неба прайшла не так балюча.

За два гады знаходжання ў Афганістане на рахунку Пятра 600 гадзін баявых вылетаў. Ён узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За баявыя заслугі».

Яшчэ не адзін год пасля Афганістана Пётр вучыўся глядзець на жыццё па-новаму. Праўда, у характары пасля ўсяго, што давялося перажыць, назаўсёды засталіся негатыўныя адносіны да несправядлівасці, грубасці, здрады.

Сваю кар’еру ваеннага Пётр Шакель закончыў на Далёкім Усходзе разам з распадам Савецкага Саюза. Расійская армія скарачалася, і многія афіцэры тады засталіся, як кажуць, за бартом.

Ён вярнуўся на родную Браслаўшчыну. Пекла афганскай вайны не змагло знішчыць у ім аптымізм і любоў да жыцця. Радасна гледзячы, як падрастаюць сыны Іван і Арсеній, тата марыць толькі пра адно, каб хлопчыкам ніколі не давялося зведаць тых выпрабаванняў, якія выпалі на яго долю.

**З. Палулех**

**Фота з архіва П. Шакеля**